# «БЕЛАРУСЬ — ГЭТА НАША ЗЯМЛЯ. ТОЛЬКІ МЫ САМІ ТОЛЬКІ МЫ НЯСЁМ РЭАЛЬНУЮ АДКАЗНАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У сярэдзіне другога дзесяцігоддзя бягучага стагоддзя не Расія і не Беларусь здзейснілі дзяржаўны пераварот у брацкай Украіне. З гэтага часу пачаўся адлік таго, што адбываецца дагэтуль. Чахарда ва ўладзе, празмерная карупцыя, галеча большай, абсалютна большай, часткі насельніцтва, непрымальны нацыяналізм з элементамі фашызму, забарона рускай мовы, знішчэнне ўсяго, што звязана з перыядам Савецкага Саюза, гераічнага мінулага: знос помнікаў, перайменаванне вуліц і герaізацыя забойцаў мірных грамадзян Беларусі, Расіі, Украіны. З апошнім мы ніяк не можам пагадзіцца і дазволіць. ***Бо гераізаваць тых, хто спальваў Хатынь і сотні вёсак на тэрыторыі Беларусі — мы ніколі не пагодзімся.***

У той час галоўным знешнепалітычным трэндам пасля дзяржаўнага перавароту, як вы памятаеце, ва Украіне стала ўступленне ў НАТА і прапанова паўночнаатлантычнаму блоку размясціць яго вайсковыя базы на тэрыторыі Украіны. Рабілася гэта акуратна (я гэта памятаю) — пад выглядам трэніровачных цэнтраў.

Улічваючы надзвычайную пагрозу бяспецы, Расійская Федэрацыя вымушана была пайсці на надзвычайныя меры, уключыўшы ў склад Расіі Крым. Заўважце, згадайце — без адзінага стрэлу. Што там адбылося і чаму гераічна тады ўкраінцы не абаранялі свой родны край, у будучыні прыйдзецца разабрацца. Падзеі на ўсходзе Украіны (Данбас) сталі працягам палітыкі знішчэння ўсяго рускага. Ідэалогія фашызму, ужо фашызму, ператвараецца ў практыку: забойствы нязгодных і падпалы, у полымі якіх гарэлі людзі (Адэсу згадайце).

Знішчэнне рускага насельніцтва, правакацыі супраць Расіі і яе кіраўніцтва вымусілі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі прыняць меры па абароне рускага чалавека. Дарэчы, хачу нагадаць, асабліва «ачумелым» сёння ў Расіі. Бо вы ж тады ад Пуціна патрабавалі спыніць генацыд рускага чалавека ў Данбасе, вы расійскую ўладу тады падштурхоўвалі да таго, каб гэтая абарона была ажыццёўлена. А што цяпер? Што адбылося? Чаму так хутка памянялі пункт гледжання і пабеглі праз розныя перавалы, граніцы, каб не дапамагчы рускаму чалавеку на Данбасе. І пайшло-пайшло супрацьстаянне на ўсходзе Украіны, якое прывяло да чалавечых ахвяр. Вы таксама гэта памятаеце».

## Трэба пачаць перагаворы. Менавіта цяпер, а не пазней

«І тады, знаходзячыся ў віры гэтых падзей, вельмі паглыбленым у гэтыя падзеі, я памятаю, як усякія прапановы аб міры з кіраўніцтвам Украіны адмяталіся. Я часта казаў, я як сабачка бегаў ад аднаго Прэзідэнта да другога і перадаваў розныя пасылы, месенджы — мне было вельмі важна спыніць гэтую вайну. І калі нічога не атрымлівалася, я рызыкнуў. Я прапанаваў: добра, раз так адбылося паміж блізкімі братамі і людзьмі, давайце тады мы станем паміж вамі, падвядзём пагранічныя войскі да той граніцы (450 кіламетраў), якую патрабавалі ўкраінцы неадкладна аддаць пад кантроль Украіны. Але і на гэта тагачасныя кіраўнікі Украіны не пайшлі. А калі перагаворы сталі фактам, які адбыўся, памятаеце, тут, у Мінску, як цяпер нам вядома, — выйграны час (гэта былі не перагаворы, гэта было прыкрыццё, гэта быў падман) выкарыстоўваўся Захадам для мілітарызацыі Украіны і ўзбраення яе арміі. Памятаеце, нядаўна пасрэднікі, якія сюды прыехалі, Меркель і Франсуа Аланд, аб гэтым заявілі: «Мы героі. Мы тады прыпынілі бойню для таго, каб даць падняцца Украіне, каб яе ўзброіць навейшымі відамі зброі». Пачалася з таго часу падрыхтоўка да поўнамаштабнай вайны з Расіяй.

Разумеючы навіслую пагрозу вайны, кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі запатрабавала гарантыі бяспекі ад спонсараў ператварэння Украіны ў «антырасію». Чым гэта скончылася, мы ведаем. Скажу шчыра, мне апошнім часам вельмі часта з пэўнымі ўплывовымі коламі на Захадзе прыходзілася абмяркоўваць гэтую тэму. Яны, як і раней, гавораць: «Гэта было несур'ёзна. Ну што там Пуцін прапанаваў? Гэта была несур'ёзная прапанова. Мы на гэта проста не маглі пайсці. Але калі гэта была несур'ёзная прапанова і якая нічога не значыла, то дайце пісьмовыя гарантыі, то чаму вы не напісалі яму гэтыя гарантыі. У патрэбны момант, як звычайна, плюнулі б на гэтыя гарантыі. Але калі забразгала вайна, чаму вы хоць бы не прадставілі на паперы гэтыя гарантыі? Цішыня.

Намаганнямі Злучаных Штатаў і іх сатэлітаў у роднай нам краіне развязана поўнамаштабная вайна — «да апошняга ўкраінца», у выніку якой толькі на працягу года загінула і скалечана каля паўмільёна чалавек з абодвух бакоў. Мільёны сталі бежанцамі. На гарызонце ў выніку замаячыла Трэцяя сусветная з ядзернымі пажарамі. Можна яшчэ шмат гаварыць аб гэтым перыядзе. Але не ў гэтым справа. Сёння не ў гэтым справа. Сёння ўнікальны, асаблівы момант, якога не будзе ні ў гісторыі Расіі, Беларусі і Украіны, ні ў сусветнай гісторыі тым больш. ***Пытанне адно — што рабіць? Усе вы разумееце і ведаеце: шлях адзін — перагаворы. Перагаворы без папярэдніх умоў!*** Ну што за «цуды»? Прэзідэнт суверэннай незалежнай краіны падпісвае ўказ, які датычыцца менавіта яго, забараняе сабе весці перагаворы аб міры. Гэта проста смешна. Кажу вам як Прэзідэнт. Калі ты не хочаш весці перагаворы, дык не вядзі іх, навошта падпісваць гэты ўказ і смяшыць усіх людзей? Што ты гэтым хочаш прадэманстраваць? Мае кантакты ў пачатку канфлікту з Уладзімірам Зяленскім сыходзіліся да аднаго — я яго проста падштурхоўваў па-братэрску, калі хочаце, па-сыноўніцку, заўсёды спрабаваў павярнуць туды, куды трэба з майго пункту гледжання. Я яму заўсёды казаў: «Валодзя, ты падумай, вайна ідзе на тваёй зямлі, на тваёй тэрыторыі. Сёння ты будзеш героем, ездзіць пад Бахмут, пад Арцёмаўск, уручаць узнагароды, а пройдзе час — народ з цябе спытае, чаму ты не спыніў гэтую вайну. Чаму ты не зрабіў усё, каб вайны гэтай не было? А калі яна пачалася, чаму ты не спыніў яе, і гінуць ні ў чым не вінаватыя людзі. Бо гінуць, я яму казаў, не твае дзеці, не твае сваякі — яны, магчыма, дзесьці на блакітным беразе забаўляюцца. А гінуць тыя, хто не павінен гінуць. І іх сваякі, калі яны загінуць, спытаюць. Кажучы па-народнаму, ну загінуў чалавек, а скалечаны — без нагі, без рукі, без абедзвюх ног, на калясцы якога перавозяць, — каму ён патрэбны? А калі ў яго сваякоў няма, якія могуць яго дагледзець? Што тады? Як бачым — цішыня. Таму трэба пачаць перагаворы. Менавіта цяпер, а не пазней. Чаму? Адказ просты: у нас марудна запрагаюць, але хутка едуць. Беражыцеся! Калі Расія раней, і ў нас таксама, прасіла зброю і боепрыпасы, каб сябе засцерагчы, сёння яна ні ў кога не просіць. Чаму? Ваенна-прамысловы комплекс, абаронна-прамысловы комплекс, я гэта ведаю дакладна, сёння Расія разгорнецца на поўную магутнасць. І калі гэты ваенна-прамысловы комплекс разгорнецца на поўную магутнасць, аб міры гаварыць будзе цяжка. Гэтая руская падвода па інерцыі калі пакаціцца, мала не падасца. Цяпер (дамаўляцца. — **«Зв.»**) — пакуль можна. Калі ж Украіна будзе напханая зброяй, заходняй, — там ужо не засталося савецкай зброі, калі перападрыхтоўку пройдуць вайскоўцы, з іншага боку таксама будзе армада. Мы страцім не паўмільёна забітымі і скалечанымі. Таму спыніцца трэба цяпер, пакуль не пачалася эскалацыя. І паспрабую рызыкнуць прапанаваць спыніць баявыя дзеянні (многія цяпер, асабліва ў Расіі, могуць сказаць: «Дык мы ўжо спынялі тады на Данбасе»), тады была іншая сітуацыя, і з улікам тых умоў — спыніць трэба баявыя дзеянні, перамір'е аб'явіць без права перамяшчэння і перагрупоўкі войскаў з абодвух бакоў, без права перакідкі зброі і боепрыпасаў, жывой сілы і тэхнікі. Усё — мёртва, замерлі! ***І калі Захад чарговы раз паспрабуе выкарыстаць паўзу ў баявых дзеяннях, як гэта было, для ўзмацнення сваіх пазіцый, зноў жа падманам (гэта было), Расія абавязана задзейнічаць усю магутнасць ВПК і арміі для прадухілення эскалацыі канфлікту***. І фосфарныя боепрыпасы, і абеднены ўран, і ўзбагачаны ўран — усё павінна пайсці ў дзеянне, калі чарговы раз будзе падман і будзе заўважаны хоць найменшы рух праз граніцу ва Украіну або з іншага боку, з боку Расіі, рух войскаў і падрыхтоўка да атакі. Вайскоўцы мяне зразумеюць. Усе пытанні: тэрытарыяльныя, аднаўленчыя, бяспекі і іншыя — трэба і магчыма вырашыць за сталом перагавораў. Без папярэдніх умоў! Гэта ж смешна (дыпламаты разумеюць), калі ідзеш на перагаворы — якія могуць быць папярэднія ўмовы?»

## Людзі не разумеюць, за што яны ваююць

«Я скажу больш. І гэта не трэба хаваць нікому. З аднаго і другога боку вайскоўцы і людзі не разумеюць, за што яны ваююць. На фронце людзі не разумеюць, за што яны ваююць, за што яны заўтра павінны ісці ваяваць. Мы перажылі тую вайну, але разумелі, што мы абаранялі сваю зямлю, і фашысты забівалі не толькі вайскоўцаў, але захацелі мардабоем заняцца (шчыра кажучы, ваенныя ідзіце — біцеся), але тады фашысты палілі ўсё запар. Мы гэта ведаем. Гэта была іншая вайна. І тады адзін бок разумеў, што ён выйграе. Сёння абодва бакі разумеюць, што дабівацца перамогі нельга. Тым больш, як украінцы лічаць, што яны пераможуць — гэта глупства. Немагчыма перамагчы ядзерную дзяржаву. ***Калі расійскае кіраўніцтва зразумее, што сітуацыя пагражае распадам Расіі, будзе прыменена самая страшная зброя. Гэтага дапусціць нельга!*** Але небяспечна трэцяе. Гэтыя людзі, якія не разумеюць, за што ваююць, на лініі судакранання дамовяцца. Здаю вам інсайдарскую інфармацыю — гэта ўжо пачалося. Камандзіры рот, камандзіры ўзводаў, камбаты пачынаюць дамаўляцца. Даходзіць да таго, што яны паведамляюць расіянам, што ў гэтым квадраце заўтра будзе нанесены ўдар. Расіяне сыходзяць. Удар нанеслі — вярнуліся. І наадварот. Інфармацыя з іншага боку, дзе ўкраінцам расіяне паведамляюць, што заўтра ў гэтым квадраце будзе нанесены ўдар, і яны сыходзяць. Людзі на фронце не хочуць ваяваць. Тыя нацыяналісты, нацмены, фашысты, якіх мы называем так, — іх ужо няма. На жаль. Гэта таксама былі людзі. Іх няма. Хто ваюе? Ваююць мабілізаваныя. Уявіце сябе на іх месцы. Уявіце: не зусім падрыхтаваныя, часта не абутыя і не апранутыя, вельмі часта галодныя, гніюць у акопах — яны, што, хочуць ваяваць? У іх у галаве — жонка, любімая жанчына, дзеткі... Яны хочуць ваяваць? Не, яны не хочуць ваяваць, бо яны не разумеюць, за што яны ваююць. Гэта галоўнае. ***Таму ад зямлі да неба, да Госпада Бога, якую праблему ні вазьмі, адно — мір, мір і мір. І трэба ісці на гэтыя перагаворы. Ісці напрамую. І не чакаць пасярэднікаў ні з Захаду, ні з Усходу.*** Трэба разумець Украіне, а можа быць, і Расіі, хоць магутнасць эканамічная несувымерная, што, калі заўтра ў якой-небудзь частцы планеты, а іскрыць усюды, успыхне самы малы канфлікт, пра Украіну забудуць. Ніхто ім не прывязе і не дасць зброі. І што тады? Нават калі не паражэнне, у адзіночку яны не адновяць краіну. Таму, узяўшы мазгі ў кулак, узяўшыся за галаву, трэба дакладна разумець усім — сесці за стол перагавораў і дамаўляцца.



Прамую трансляцыю Паслання глядзяць на прадпрыемстве ААТ «Гомельдрэў».

Фота БелТА.

Але, на жаль, цяпер, як вы чуеце, шмат размоў аб «контрнаступленні» Узброеных Сіл Украіны. На мой погляд, гэта надзвычайна небяспечна, гэта горшае, што магчыма ў цяперашніх умовах, бо можна перакрэсліць усе спадзяванні на перагаворны працэс, што прывядзе да незваротнай эскалацыі канфлікту! Разумееце, што адбудзецца. ***Разлічваць на перамогу, як я ўжо казаў, з дзяржавай, якая валодае ядзернай зброяй, — вар'яцтва!»***

## Беларусь спрабуюць уцягнуць у вайну

«Ну а што для нас? Для нас што? Вайна не там, дзесьці далёка — у Афганістане, у Сірыі, у Лівіі. Яна ўжо ў нас, за нашым плотам. Востры канфлікт, унутры, вы бачыце, што адбываецца. ***Адбываецца тое, аб чым я вас папярэджваў у 2020 годзе. Яны паспрабавалі ўсё тады і перайшлі да адзінага варыянта, ваеннага, каб нас зламаць. Вось гэта і адбываецца. Нагода заўсёды знойдзецца».***

Беларусь спрабуюць уцягнуць у вайну. Асабліва шчыруюць нашы суседзі. Гэтыя факты не схаваеш. Толькі факты.

**Першае.** На ваенныя патрэбы толькі ў 2023 годзе Польшча плануе накіраваць каля 21 мільярда еўра, або 3 працэнты ад ВУП (на 70 працэнтаў больш, чым у 2022 годзе). Нават амерыканцы сабе такога росту не дазвалялі. Да 2024 года гэта лічба можа вырасці ў 28 мільярдаў еўра (больш чым 4 працэнты ад ВУП). Гэта ў 2 разы больш за 2 працэнты, што прадпісваюцца стандартамі НАТА. Навошта? Хто ёй пагражае?

**Другое.** Узмоцненымі тэмпамі ідзе пераўзбраенне арміі. Прычым наступальнага характару. Толькі ў адпаведнасці з апошнімі кантрактамі Польшча ў найбліжэйшы час атрымае 366 танкаў «Абрамс» і 1000 паўднёвакарэйскіх «Чорных пантэр», а таксама 894 самаходныя гаўбіцы K9A1, 38 ПУ РСЗА «Хаймарс» і 50 ПТРК «Джавелін», 1400 БМП «Барсук», якія яны выробляюць самастойна.

**Трэцяе.** Прынята рашэнне аб павелічэнні колькасці ўзброеных сіл да 300 тысяч чалавек да 2035 года. Гэта значыць, практычна ў 2 разы больш, чым Польшча мае сёння. Рэалізацыя гэтых планаў выводзіць Варшаву на лідарскую пазіцыю сярод краін НАТА ў Еўропе. Гэта робіцца амерыканцамі свядома.

**Чацвёртае.** Адначасова паскоранымі тэмпамі ідзе перакідка войскаў НАТА на ўсход. Групоўка блока толькі ў Польшчы і краінах Балтыі сёння налічвае больш за 21 тысячу вайскоўцаў, 2,5 сотні танкаў, амаль 500 бронемашын, каля 150 самалётаў і верталётаў. І ўся гэтая армада дэманстратыўна трэніруецца каля граніц Беларусі і Расіі. Пытанне тое ж — навошта?

**Пятае.** Там жа поўным ходам ідзе фарміраванне нейкіх палкоў, харугваў, легіёнаў для наступнага перавароту ў Беларусі. Прыйдзе час — мы вам выкладзем гэта ўсё. Сёння не час, ідзе закрытая карпатлівая работа. Але, паверце на слова, я вас ніколі не падманваў. Яны рыхтуюцца ўварвацца на тэрыторыю Беларусі для знішчэння нашай краіны. Робяць з нашых збеглых баевікоў проста бандытаў, якіх не шкада. Ім іх не шкада, мы таксама маем гэту інфармацыю. Першы вопыт яны сёння атрымліваюць ва Украіне. Праўда, больш як гарматнае мяса.

**Шостае.** Адначасова рыхтуюць і закідваюць тэрарыстаў у нашу краіну для правядзення дыверсій і актаў запалохвання. Спрабуюць стварыць падпольныя экстрэмісцкія ячэйкі для каардынацыі пратэснай дзейнасці. Перадаюць узбраенне і фінансавыя сродкі.

Вы думаеце, усё гэта проста так?

У іх ёсць канкрэтныя планы, і яны не саромеюцца пра гэта казаць адкрыта. Некалькі цытат.

Цэнтральны інспектар узброеных сіл Германіі генерал-палкоўнік Цорн у канцы мінулага года: «Беларусь можа ўступіць у вайну. У гэтым выпадку краінам — членам НАТА трэба пачаць таемныя аперацыі супраць цэляў на яе тэрыторыі. (Мы яшчэ не ўступілі нікуды. Яны ўжо пачалі гэта.) НАТА павінна падрыхтавацца падтрымаць ваеннымі сродкамі палітычныя змены ва Усходняй Еўропе. (Мы гэта ў 2020 годзе бачылі. Яны хочуць палітычных змен, але ўжо са стрэльбай у руках — прыйсці да нас і ажыццявіць гэтыя палітычныя змены.) Такімі пераменамі могуць стаць дэмакратычная рэвалюцыя і народнае паўстанне ў Беларусі».

Міністр абароны Польшчы Блашчак у канцы мінулага года: «Калі Украіна не зможа дасягнуць вырашальнай перамогі на Усходзе, то НАТА павінна сур'ёзна разгледзець пытанне адкрыцця другога фронту супраць Беларусі». На адной з закрытых нарад ён агітаваў прысутных да гэтага.

І яшчэ адно вар'яцтва. Камандуючы 101-й паветрана-дэсантнай дывізіі ЗША генерал-маёр Макгі, канец мінулага года: «Беларусь з'яўляецца адной з магчымых цэляў. 101-я дывізія падрыхтавана для заняцця стратэгічных пунктаў на тэрыторыі Беларусі».

Гэта літаральна некалькі цытат апошняга часу. Некалькі фактаў, здабытых нашай разведкай».

## Мы заслужылі мір

***«У існуючых абставінах і ваенна-палітычнай абстаноўцы вакол нашай краіны мной былі актывізаваны настойліва перагаворы з Прэзідэнтам Расіі па вяртанні ў Беларусь ядзернай зброі. Менавіта па вяртанні ядзернай зброі, якая была выведзена ў 90-х гадах.*** Тады пад гарантыі ніякіх санкцый супраць тых, хто вывеў, ніякага ціску, ніякага планавання наступу і рэвалюцый. Усё растаптана, усё разбурана! Я маю права паставіць пытанне вярнуць ядзерную зброю, якую тады яшчэ да мяне вар'яты падпісалі абавязацельства вярнуць. Я памятаю, калі на мяне ціснулі. Я прыпыніў гэты вывад. Я не стаў выводзіць у 1994—1995 гадах зброю, я быў падвергнуты самаму жорсткаму ціску з боку не толькі Захаду, але і Прэзідэнта Расіі. Я сказаў: «Не, я не буду выводзіць». Ён мне кажа: «Ну ты зразумей, раздушаць, знішчаць, ды і абслугоўваць ты не зможаш стратэгічныя боегалоўкі». Вы памятаеце, тады на ўзбраенні тут стаялі самыя сучасныя «Тапалі», якія цяпер у Расійскай Федэрацыі. Тады быў неймаверны ціск. У нас акрамя сваёй валюты, акрамя «зайчыкаў», нічога не было, тое, што засталося нам у спадчыну. Я вымушаны быў адступіць пад пэўныя гарантыі.

Усё зняважана, усё забыта. Вынік вядомы. Я не спрабую каго-небудзь запалохваць, шантажыраваць, чарговы раз пра гэта кажу. Гасподзь з імі.

***Я хачу абараніць беларускую дзяржаву і забяспечыць мір беларускаму народу!!! Сваёй гісторыяй, усім сваім існаваннем мой народ гэтага заслужыў! Пад бізуном жыць больш не жадаем! Рабамі не будзем!***

У нашай гісторыі, я вам гэта кажу як гісторык, крытычных сітуацый было шмат. Але нам хапіла мудрасці захаваць сябе і сваё месца на палітычнай карце свету, абараніць суверэнітэт.

Памятайце, я вам казаў — дарагая рэч — і пытаўся, ці гатовыя плаціць за гэта.

А суверэнітэт азначае, што толькі мы, грамадзяне Беларусі, маем права казаць аб сваіх нацыянальных інтарэсах і вызначаць нацыянальныя мэты далейшага развіцця на тэрыторыі сваёй дзяржавы».

## Першая ўмова суверэнітэту і незалежнасці: народнае адзінства

«Мы, беларусы, заўсёды дэманстравалі яго ў пераломныя моманты гісторыі. Менавіта адзінства давала нам сілы для перамогі над ворагамі і абставінамі.

Так было ў гады рэвалюцыйных ліхалеццяў, калі беларускі народ не ўпусціў шанцу стварэння асноў нацыянальнай дзяржаўнасці. Так было ў 1939-м, калі ўз'ядналіся нашы гістарычныя землі, што было б немагчыма без імкнення беларусаў жыць у адной сям'і.

Так было ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі акупанты сутыкнуліся з сапраўды ўсенародным супраціўленнем, беспрэцэдэнтным у гісторыі свету. І плячо ў плячо хто з намі стаяў тады ў лясах і балотах? Нашы славяне, нашы рускія людзі. Адсюль адказ — чаму мы сёння з імі.

У цяжкі пасляваенны час, у цяжкія 90-я, у перыяды сусветных крызісаў і ў пандэмію беларусы заўсёды былі адзіныя перад цяжкасцямі і выклікамі. Я чуў вас — вы чулі мяне. ***Усе разам мы выстаялі пад націскам ліберальных мадэляў, выцягнуўшы краіну з разрухі, з прорвы. Захавалі пераемнасць гістарычных эпох і традыцый.***

***І ўсе стратэгічныя рашэнні мы прымалі самі. Як бы нас не вінавацілі, што намі нехта кіруе. Самі. Прымалі пераважнай большасцю галасоў на рэферэндумах і выбарах, падтрымліваючы палітычны курс краіны, якім ідзём амаль тры дзесяцігоддзі. Большасцю мы выдужалі і ў 2020-м.*** Гэта відавочна нават для тых, хто кіраваў тым варварскім бліцкрыгам. Праўда, час бы ім ужо публічна прызнаць сваё паражэнне.

Мы не хочам, каб гэта паўтарылася. Але калі б не было 20-га года, яго трэба было б прыдумаць! Жнівень 20-га паказаў, хто ёсць хто. ***Жнівень 20-га паказаў нашы пралікі, сканцэнтраваўшы нашу ўвагу на недапушчальнасці самазаспакаення і расхлябанасці.***

Мы думалі, што ўсё добра, Бога за бараду ўзялі і жывём лепей, чым іншыя, асабліва суседзі, дзе пастаянна штарміць. Аказался, што пэўнай частцы грамадства гэта не падабаецца, гэта не трэба. Якой частцы і што не падабаецца — мы сёння ведаем. Але гэта быў вельмі важны момант у нашай гісторыі. І дзякуй богу, што ён быў. І дзякуй богу, што ён гэтым скончыўся. Я пасля гэтага вам пастаянна кажу, звяртаю вашу ўвагу — не расслабляйцеся. Не расслабляйцеся — паўторыцца гэта ўсё. Ці ўсе мяне пачулі? Шчыра скажу, далёка не ўсе.

А галоўнае, мы «на зуб» паспрабавалі іх дэмакратыю і правы чалавека. Мы зразумелі на сваім горкім досведзе: жыць спакойна нам не дадуць! Мы казалі так у 2020-м. А сёння мы бачым, што не даюць нам жыць спакойна.

Выкарыстоўваючы перадышку паміж палітычнымі баталіямі, большасцю ў мінулым годзе на канстытуцыйным узроўні мы вызначылі шэраг новых стратэгічных напрамкаў. Прычым захавалі пераемнасць палітычных традыцый. Гэта найважнейшае дасягненне гісторыі нашай дзяржаўнасці.

Я ўдзячны ўсім, хто ўключыўся ў абмеркаванне новай рэдакцыі Асноўнага Закона, хто прыняў удзел у рэферэндуме 2022 года. Гэта мільёны. ***Такой аднадушнасці наша гісторыя яшчэ не ведала. Дзясяткі тысяч прапаноў былі разгледжаны. І ўсе канструктыўныя ідэі прааналізаваны і знайшлі адлюстраванне, калі не ў Канстытуцыі, то ў іншых нарматыўна-прававых актах.***

Шмат хто кажа, што Лукашэнка зрабіў гэту Канстытуцыю пад сябе. Але прабачце, не я яе рабіў і гэта шчыра магу вам сказаць, я не ўмешваўся ў гэты працэс. Канстытуцыйная камісія, створаная з прадстаўнікоў розных пластоў грамадства, уносіла прапановы, рабілі гэта публічна. Таму не трэба папракаць, што я прыняў гэтую Канстытуцыю. Але нават калі зыходзіць з гэтага. Паверце, мой век заканчваецца, і ніякія Канстытуцыі я рабіць пад сябе не буду. Я памятаю, калі я прыйшоў да ўлады, тады душылі, труцілі, стралялі. Але каманда з дзясятка чалавек вытрымала, і людзі нам паверылі. Сіваваласыя людзі сядзяць тут і нават тыя, хто былі супраць мяне... Мы нікога тады не ціснулі і не цкавалі, мы працавалі разам, разумеючы, што краіну трэба ратаваць. Прайшло амаль 30 гадоў, ну, колькі можна. Я з гэтага зыходжу. Не думайце, што я, учапіўшыся ў крэсла, трымаюся за гэтую ўладу. Абсалютна шчыра вам пра гэта кажу. Вы бачыце, якія абставіны. І шмат хто хацеў бы, каб Лукашэнка не быў. А калі яны хочуць там, каб мяне не было, значыць, трэба рабіць наадварот. Гэта мой прынцып.

*Пасля гэтага ў зале раздаліся апладысменты.*

Вы мяне няправільна зразумелі. Гэта не значыць, што я з-за абставін буду трымацца за гэтую пасаду. Не, не і яшчэ раз не. Я думаю аб будучыні. Бо, як ва ўсіх вас, у мяне ёсць дзеці, унукі, якія павінны жыць у мірнай, незалежнай краіне. Я ж больш за іншых разумею, што не будзе Лукашэнкі — дык дзяцей будуць ціснуць з усіх бакоў, магчыма, і ўнутры дададуцца тыя, якім нешта не падабаецца і будуць даставаць праз дзяцей, а гэта для мяне непрымальна, як і для вас. Будуць ціснуць і труціць вашых дзяцей. Асабліва тых, хто ў 2020 годзе стаў і вытрымаў. Будуць здзекавацца з людзей у пагонах, якія гарантуюць нашу бяспеку і якія тады выканалі ўсе загады Прэзідэнта. Я думаю пра гэта, а не пра гэтую «дзяшоўку», у якой мяне спрабуюць папракнуць, што Лукашэнка стварыў Канстытуцыю пад сябе.

Я з гэтага зыходзіў, прапануючы вам змены ў новую Канстытуцыю.

Вы думаеце: «Цяпер ён скажа, будзе ён Прэзідэнтам ці не». Яшчэ раз паўтараю небанальныя рэчы. Гэта вы вырашыце, хто будзе вашым Прэзідэнтам. Але вам адразу скажу: я наеўся. Вы вырашыце, і спынімся сёння аб гэтым казаць. ***Да сваіх апошніх дзён на гэтай пасадзе я буду працаваць на карысць нашай краіны. Я ніколі не буду кульгавай качкай. У мяне дастаткова паўнамоцтваў для таго, каб абараніць сваю краіну, асабліва цяпер.*** Я больш, чым вы, зацікаўлены, каб яе захаваць. Бо я ўклаў у яе ўсё сваё жыццё. Я не бачыў гэтага жыцця, акрамя сваёй Беларусі. Таму трэба спыніць размовы аб пераемнасці, аб спадчыннасці. Мае дзеці прэзідэнтамі не будуць. Вы павінны гэта памятаць і таксама не абсмоктваць, і не казаць на гэтую тэму. ***Мы разам з вамі, і я ў тым ліку, пакуль мы жывыя, сваіх заваяванняў не аддадзім. Не аддадзім — значыць, будзем жыць мы і будуць жыць нашы дзеці.***

Але нельга думаць, што памянялі Канстытуцыю, і на гэтым усё. Не. На прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з новымі нормамі застаўся год. Час ідзе хутка. Мой зварот да беларускага народа і парламента. Таму я кажу пра заканатворчасць.

Што мы маем цяпер? З амаль 100 заканадаўчых актаў ужо прынята або разгледжана ў першым чытанні ў парламенце больш за палову. Нам жыць па гэтых законах. Прыняты ключавыя, я б сказаў, унікальныя ў сваім родзе законы «Аб Усебеларускім народным сходзе», «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», скарэкціраваны ў адпаведнасці з Канстытуцыяй законы аб Нацыянальным сходзе, аб Савеце Міністраў, аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі.

Набраны добры тэмп. Цяпер, як я ведаю, каля 25 праектаў знаходзіцца ў парламенце. Трэба паскарацца. Вы людзі дасведчаныя, дэпутаты, сенатары, высокапрафесійныя, надзейныя. Здольныя працаваць з апярэджаннем графіка.

***Таксама большасцю на рэферэндуме-2022 мы прагаласавалі за гістарычную справядлівасць. Найстаражытнейшая беларуская традыцыя народаўладдзя, якая ў сучаснай гісторыі дзяржавы рэалізоўваецца як Усебеларускі народны сход, набыла канстытуцыйны статус. Толькі народ мае права вырашаць свой лёс...***

У нашым Сходзе гучыць голас усіх: ад сельскіх працаўнікоў да навукоўцаў. У ім прадстаўлены ўсе сферы, усе пласты грамадства і палітычныя погляды. Думаю, што дэлегаты канстытуцыйнага органа будуць такімі ж. Там павінна быць месца і рабочаму, і селяніну, і кіраўніку, і палітыкам. Больш скажу: ***і дэлегатаў УНС, і прадстаўнікоў у мясцовыя Саветы і парламент выбіраць будзе беларускі народ, і толькі ён, а не нейкія міфічныя назіральнікі ад АБСЕ.***


Прамую трансляцыю Паслання глядзяць у Магілёўскай бальніцы № 1.

Фота БелТА.

Журналісты некаторыя разумна разважалі: «Ну Лукашэнку навошта гэтая Канстытуцыя, і тая Канстытуцыя была пад яго, ды яшчэ якая». Я хачу сапраўднай дэмакратызацыі, наколькі гэта магчыма. Я хачу, каб людзі жылі паводле закона. Другі раз пра гэта кажу, але вы так і не зразумелі, што я маю на ўвазе. Многае цяпер робіцца ад імя Прэзідэнта. Ёсць закон, няма закона — усё бягуць да Прэзідэнта: прымі рашэнне. Можа, у цяперашняй сітуацыі гэта і правільна. Гэта цяжкі крыж. Мы быццам бы памылак вялікіх не дапусцілі, калі адзін чалавек прымаў рашэнне. Але гэта не азначае, што так будзе заўжды. Прыйдзе новы чалавек. Хто ён будзе? Ой, як будуць прыгожа вам казаць, ой, як будуць абяцаць, і цукар, і крупы прывязуць пад выбары. Усё будзе. А што будзе потым, калі абяруць? Мы не ведаем. Той перыяд часу, калі будзе пераход да новай улады, нават да новага пакалення, нам трэба засцерагчы краіну. Нам трэба засцерагчы тых патрыётаў, якія жадаюць жыць у гэтай краіне.

Нагадаю: да найбліжэйшых выбараў засталося менш за год. Такога маштабнага выбарчага працэсу ў нас яшчэ не было. Падрыхтоўку да яго мы ўжо пачалі. Абнавілі выбарчае заканадаўства. Вызначылі прававыя рамкі дзейнасці грамадзянскай супольнасці і партый...

Але, паўтару, ***замежных агентаў, праплачаных з-за мяжы, у нашым палітычным полі не будзе. Кропка! Роўна як і партыі ўлады таксама не будзе.*** Для тых, хто забыўся, з якой праграмай я ішоў на першыя выбары Прэзідэнта, нагадаю: «Ні з левымі, ні з правымі, ні з партыяй, а са сваім народам!» Мая пазіцыя не змянілася.

***І дэпутаты, якую б партыю ці грамадскі рух ні прадстаўлялі, найперш павінны служыць людзям, а не інтарэсам асобных алігархаў і палітыкаў, тым больш замежных...***

Напярэдадні чарговай выбарчай кампаніі мае пытанне да дэпутатаў усіх узроўняў: ці ўсё вы зрабілі, што абяцалі выбаршчыкам? Час завяр-